УДК 821(161.2+161.3)

М. І. Чмарава
Установа адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”,
кафедра літаратуры і міжкультурных камунікацый

СПЕЦЫФІКА ВЫРАШЭННЯ САЦЫЯЛЬНЫХ ПРАБЛЕМ У ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ І ТАРАСА ШАЎЧЭНКІ: ТРАДЫЦЫІ І НАВАТАРСТВА

В статье анализируется специфика художественного воплощения социальных проблем в творчестве Янки Купалы и Тараса Шевченко, общие и отличительные черты, традиции и новаторство, которые предопределили подходы в отражении действительности Украины и Беларуси.

The article analyzes the specificity of artistic embodiment of the social problems in the poetry of Yanka Kupala and Taras Shevchenko, common and distinctive features, tradition and innovation, which determined the approaches in reflection of the reality of Ukraine and Belarus.

Ключевые слова: поэзия, Беларусь, Украина, национальные традиции, историческая память и наследие, социальная справедливость и историческая перспектива, Янка Купала, Тарас Шевченко.

Key words: poetry, Belarus, Ukraine, national traditions, historical memory and heritage, social justice and historical perspective, Yanka Kupala, Taras Shevchenko.

У сваіх ранейшых публікацыях мы закраналі праблему тыпалагічных сыходжанняў творчасці Янкі Купалы і Тараса Шаўчэнкі, спецыфіку асэнсавання хрысціянскіх матываў у іх творчасці, а таксама літаратурна-эстэтычныя погляды [1, с. 160–163; 2, с. 105–110]. Не менш значнай і цікавай для даследавання з'яўляецца пытанне мастацкага вырашэння сацыяльнай праблематыкі ў творчасці абодвух паэтаў, якое мае як агульныя, так і адрозныя рысы.

У раннім вершы “*Я не для вас...*” Я.Купала, вызначаючы сваё месца ў жыцці і літаратуры, заяўляў, што яго Муза будзе служыць толькі бедным людзям: “*Я не для вас, паны, о не, / А я для бедных і загнаных / Я з імі мучыўся ўраўне, / Ў адным закут з імі кайданах*” [3, с. 152]. Я.Купала называе паноў “нікчэмнымі прыблудамі”, якія марнуюць жыццё і глухія да “плачу свайго люду”.

Паэт у дадзеным выпадку, відавочна, наследуе традыцыю, так званай краёвай літаратуры Беларусі XIX ст. (напрыклад, творчасць Ф. Карпінскага

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

(“*Муза з вясковай далі*”). Паны адлюстроўваюцца як нікчэмныя людзі і касмапаліты, якія выракліся традыцый продкаў, забыліся на свой народ і прадалі душы д’яблу, блукаючы па чужыне. Ф. Карпінскі і Я. Купала аднолькава не жадаюць быць побач з панамі-здраднікамі. Мусіць таму знакаміты аўтар “Sielianek” вярнуўся з Варшавы ў родную беларускую вёску, бо ведаў, што гучыць там усё яшчэ бацькоўская мова. Тое ж заўважаецца і ў “камедыі” Ю. Нямцэвіча “*Вяртанне дэпутата*” (“*Powrót Posła*”). Пан Шарманцкі вяртаецца з чужыны злым і нялюдскім, ён марыць толькі пра адно – як мага больш выцягнуць грошай з мясцовага люду.

Галоўны герой “*Ідыліі*” В. Дуніна-Марцінкевіча – Караль Лятальскі таксама марыць пра атмасферу Парыжа, а тутэйшых прыгонных сялян называе бяздушным быдлам. Менавіта пра такіх паноў, якія здрадзілі шляхецкай традыцыі і напісаў Я. Купала ў наступных радках: “*Я не для вас, паны, о не, / Над доляй плачу свайго люду, / З гразёй змяшалі б вы мяне / Сваёй нікчэмнасцю прыблудаў*” [3, с.152].

Падобныя да купалаўскіх матывы паўстаюць і ў творчасці Т. Шаўчэнкі, які ў знакамітым “*Наследаванні 11 псалма*” заявіў: “*<...> Дзеля іх, / Людзей закованых маіх, / Убогіх, бедных... Узвялічу / Малых вось тых рабоў нямых! / І я на варце каля іх пастаўлю слова!*” [4, с. 533].

Як і Я. Купала, Т. Шаўчэнка супрацьпастаўляе Божых людзей, “бедных небаракаў”, якія яшчэ не забыліся пра сумленне, і злых паноў, якія тоящь злобу ў сэрцы адзін на аднаго. Кабзар быў занепакоены тым, як гінула Ўкраіна пад царскай уладай і яго прыслугачоў – “*польскіх та рускіх паноў*”. На Ўкраіне склалася больш праблематычная сітуацыя, чым на Беларусі, бо спрадвечнай шляхты там не існавала, край пасля Люблінскай уніі 1569 г. быў па сутнасці каланізаваны. Таму кожны шляхціц (ці з Польскай Кароны, ці з Вялікага Княства) успрымаўся як вораг – “*пракляты, хітры лях*”, “*варожая варначая кроў*”. Асабліва відавочна гэта заўважаецца ў паэме “*Гайдамакі*”, а таксама ў вершах “*Чыгрыне...*”, “*Халодны яр*” і інш.

На Беларусі склалася адваротная сітуацыя, бо існавала свая, спрадвечная шляхта, якая абараняла гонар Радзімы і народа. Але гэтая шляхта была знішчана. Я. Купала не мог не ведаць пра тое, што ўжо пасля 1831 г. засталася яе невялікая частка, а пасля 1864 г. і тая рэштка была рэпрэсавана.

Паказальным з’яўляецца ў гэтым плане і змест драмы Я. Купалы “*Раскіданае гняздо*”. Як адзначае даследчыца А. Бурбоўская, “сямейны план у драме – гэта толькі мастацкая непазбежнасць. Твор мае агульначалавечае гучанне, бо сваім зместам раскрывае чытачу агульнанародную трагедыю – адлучэнне селяніна ад зямлі” [5, с.19]. Трагедыя гэтая – вынік той палітыкі Расійскай імперыі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і далучэння земляў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Беларусі да Расійскай імперыі. Менавіта з таго часу па загаду Кацярыны II пачалася "чыстка" мясцовага дваранскага саслоўя (г.зн. шляхты), бо ў параўнанні з Цэнтральнай Расіяй яно было незвычайна шматлікім і ў пераважнай большасці складалася з дробных землеўладальнікаў.

Шляхціцы ці іх продкі абаранялі Айчыну (калі нават прыгонны селянін ішоў бараніць краіну, ён атрымліваў вольную грамату, надзел зямлі і статус шляхціца / шляхецкае званне). Расійскія ўлады запатрабавалі ад беларускай шляхты (як і ад польскай), прад'яўлення дакументаў на дваранскае званне. Дробная шляхта часта не мела іх і выключалася з дваранскага саслоўя, губляючы свой сацыяльны статус. Гэты працэс увайшоў у гісторыю пад назвай "разбор шляхты" і расцягнуўся на многія дзесяцігоддзі.

На змену беларускай шляхце прыйшлі "падпанкі", якія ўжо не ведалі традыцый свайго краю і выракаліся іх. Ім ўжо не было справы да гонару Айчыны, а таму і не шкадавалі сялян, бо мелі абсалютна іншую ментальнасць і дэвіз у жыцці: "*Маю грошы, маю я / Мне ніхто тут не раўня*" (маналог Сабковіча ў "*Залётах*" В. Дуніна-Марцінкевіча). Але нават і ў такой сітуацыі знаходзіліся паны, якія клапаціліся пра лёс сялян, былі сапраўды ім бацькамі, а не злымі тыранамі. Я. Купала, вядома ж, бачыў і ведаў не толькі прыклады злога, але і добрага.

На Украіне – адзінымі абаронцамі народа былі казакі, а па сутнасці бандыты-гайдамакі, якіх даволі неабачліва апаэтызаваў Т. Шаўчэнка ў аднайменнай паэме. На паноў жа ўкраінскаму народу спадзявацца было няма чаго, і. Т. Шаўчэнка гэту ісціну добра разумеў: "*А панства будзе калыхаць, / Палацы, цэрквы мураваць / І п'яніцу цара ліхога / Ды візантыйства ўслаўляць. / А болей, мусіць, і нічога*" [4, с. 532].

Гэта вера, хоць яна і значна слабейшая, але таксама праяўляецца і ў творчасці Я. Купалы (напрыклад, верш "*Пашкадуй мужыка*"). Заўважым, менавіта "братам" называе аўтар пана, даючы яму парады: "*Пашкадуй жа ты, брат, мужыка, / Каб было яму жыць весялей! / Пашкадуй – не адсохне рука, / Пашкадуй, не чакай, а хутчэй!*" [3, с. 293].

Наследуе Я. Купала і традыцыю выяўляць "*дзяцей аканомаў*" – як асноўных носьбітаў сацыяльнага зла. У вершы "*І як тут не смяяцца*" паўстае відавочнае падабенства Марцінкевічаўскага Сабковіча ("*Залёты*"), нібыта "*пана*", але з "*лядашчага роду*" ды "*сабачай крыві*". Пан гэты "*глядзіць на цэлы свет з пагардай*", ён – гаспадар жыцця, але быў колісь не вяльможным, а "*авечак гандляром*".

Я. Купала, звернем увагу, увесь час падкрэслівае плебейскае паходжанне сваіх адмоўных персанажаў. Цягнуць жылы з народа не шляхціцы, а буржуа – прайдзісветы і гандляры. Вось і аканом, які лае "*вясковых людзей*", "*пасвіў шчэ нядаўна ў вёсцы той свіней*". Тое ж можам сказаць і пра

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“*хітрага мужычка*”, які, як “*чорт, перамяніўся*” пасля абрання старшынёй: “*Ён мужыкоў, як ліпак, / Абдзёрці ва ўсім рад*” [3, с. 29].

Ёсць у вершы і вобраз шляхціца, але ён, хоць і падаецца ў сатырычным плане, але не выклікае асаблівых негатыўных эмоцый. Беларускі шляхціц варты шкадавання, а не пракляццяў, бо гэтак жа сама церпіць нядолю і паборы. Я. Купала добра ведаў пра стан шляхты, якія ў часы Рэчы Паспалітай – былі роўнымі каралю, а зараз “*мучаюць душу заціркаю*”, “*лапці на ногі надзяюць*”. Увесь іх грэх – старадаўняя пыха, фанабэрыстасць, якая не дазваляе падаць рукі бяднейшаму брату. Купалаўскі шляхціц – нашчадак тых шляхецкіх сямей, якія ўжо ў XIX ст. збяднелі, страцілі былы ўплыў, а некаторыя і змаргіналізаваліся, пакінуўшы пасля сябе толькі сумныя ўспаміны.

У вершах Т. Шаўчэнкі абсалютна няма нават хісткай надзеі на сацыяльнае прымірэнне. Паэт ведаў пра тое, што яго народ-“*нябога*” мусіць сам шукаць “*долі й волі*”, а не “*дык без той долі на чужыне дай прападаці*” (“*Неафіты*”). У вершах і паэмах Т. Шаўчэнкі паны, падкрэслім, не столькі сацыяльныя, колькі нацыянальныя, культурныя і ментальныя ворагі ўкраінскага народа. Найбольш яскрава гэта думка паўстае ў паэме “*Гайдамакі*”.

Т. Шаўчэнка звяртаецца да гісторыі, адлюстроўваючы падзеі, якія адбыліся напярэдадні першага падзела Рэчы Паспалітай (1772 г.). Песімістычна глядзе паэт ў мінулае Украіны, заўважаючы: “*Усё мінула” – і добрае, і злое”, бо ад казацтва ды гетманства – толькі і засталіся, што “курганы ды магілы*”. Вырашэнне гэтага пытання Кабзар жадае пачуць з вуснаў тых “разумнікаў”, якія “*ўсё з асветай, пішуць кнігі / Сонца на’т асудзяць. / Не адтуль – кажа – усходзіць, / Ды не так і свеціць*” [4, с. 58]. Але, як лічыць украінскі паэт, адукаваныя і “*хітрыя дзеці*” праўды не ведаюць, з гора народа яны толькі “*пасмяюцца, пажартуюць, дый кінуць* [яго] *пад лаву*”. Аналагічнае пытанне задае кніжнікам і Я. Купала ў вершы “*Песенька для некаторых маладых людзей*”. Шмат, сцвярджае паэт, “*у нас развялося*” тых, хто “*праўд нейкіх шукае на свеце няснёных*”, “*над бедным галосе*”, але жыве “*чужымі трудамі, не знаючы гора нікольки*” [3, с. 51].

Такім чынам, і Т. Шаўчэнка, і Я. Купала ведалі пра лёс свайго народа не з кніжак, а з самога жыцця, таму і адчуваюць “*праўду тую, што ў сярмягах*”, не розумам, а сэрцам, бо разумнае слова, па словах Кабзара, “*нат брахнёю падбіта*”. Таму і заклікаюць паэты прыслухоўвацца да народнай паэзіі, дзе паўстае святая і горкая праўда.

Літаратура

1. Чмарава, М. І. Спецыфіка вырашэння тэадыцэі ў творчасці Тараса Шаўчэнкі і Янкі Купалы / М. І. Чмарава // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: да 900-год-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дзя Кірылы Тураўскага і 200-годдзя Тараса Шаўчэнкі : матэрыялы XI Міжнар. навук. канф., Мінск, 24–26 кастрычніка 2013 г. : у 2 ч. / пад рэд. Т. П. Казаковай. – Мінск : РІВШ, 2013. – Ч. 1. – С. 160–163.

2. Чмарава, М. І. Украінскі вектар у беларускай літаратуры XIX пачатку XX ст / М. І. Чмарава / Итоги научных исследований ученых МГУ им. А. А. Кулешова, 2014 : сб. науч. ст. / под ред. Е. К. Сычовой. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2015. – С. 105–110.

3. Купала, Я. Збор твораў : у 7 т. / Я. Купала. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – Т. 1. – 535 с. ; Т. 2. – 439 с.

4. Шаўчэнка, Т. Кабзар / Т. Шаўчэнка / пер. з укр. Я. Купалы і Я. Коласа, пад рэд. Р. Няхая. – Мінск : Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1952. – 616 с.

5. Бурбоўская, А. У Гістарычны, сімвалічны і прарочы характар твораў Янкі Купалы – галоўны сродак узнаўлення самапазнання / А. У Бурбоўская // Наша вера. – 2002. – № 4. – С. 19–22.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова